# АКУПАЦЫЯ

## (10.07.1941-10.07.1944)

*(Працяг. Пачатак у №№ 67-68, 76-77, 120, 123-124, 126, 130-131, 134).*

У 1940 годзе гаспадар – былы сакратар польскага павятовага суда С. Вашчула – быў арыштаваны органамі НКУС і высланы ў Сібір. Жонка і сын страцілі дом. У гады акупацыі вярнуліся ў яго. У 1944 годзе выехалі з Лунінца з адступаючымі войскамі вермахта.

У тыя гады ў хоры Лунінецкай царквы было некалькі мужчын і жанчын, якія валодалі добрымі галасамі. Часта ў храм прыходзілі нямецкія афіцэры і чыноўнікі нават з жонкамі, каб паслухаць царкоўнае песнапенне.

Прыслужнікаў у царкве было 4: Толік Вашчула, я, Касцючэнка (здаецца, Яўген) з Прыпяцкай, і старшы сярод нас – Георгій Слізень. У нашы абавязкі ўваходзіла аказваць дапамогу свяшчэнніку пры богаслужэнні, падносіць падсвечнік з запаленымі свечкамі, падаваць кадзіла, распальваць яго, выходзіць у час службы з падносамі «ў народ» для збору ахвяраванняў (грошай), а пасля службы – дапамагаць убіраць царкву. Некалькі раз даводзілася «прыслужваць» па гаспадарцы на прыёмах у доме свяшчэнніка І. Бекіша, які стаяў побач з царквой. Гасцямі яго былі нямецкія афіцэры і чыноўнікі. Я ўдзельнічаў у якасці «дапаможнага рабочага» – прынесці дроў, вады, убраць посуд, глядзець за плітой і т.п. Аднойчы ў гэтым папоўскім доме сустрэў «Пушынку» з «Крывагубцам». Бачыў іх вельмі блізка. Запомніліся кароткія тоўстыя пальцы на руках, парослыя рыжымі валасамі. На адным з пальцаў красаваўся масіўны залаты персцень з нейкім цёмным каменем.

Вяртаючыся зноў да школьных спраў, неабходна дадаць, што ў 1939-1940 гадах Аляксандра Тулейка ўзначальвала ў Лунінцы курсы па перападрыхтоўцы польскіх настаўнікаў і навучанню жадаючых стаць настаўнікамі для работы ў зноў адкрытых школах з савецкай ідэалогіяй. Прызначылі яе, відавочна, таму, што яна мела нейкія адносіны да Лунінецкай

*ведна, польская. Рускую мову выкладаць больш не патрэбна...*

*Роўна, студзень 1942 г. Рэйхскамісар Украіны».*

Лунінцу «пашанцавала». Стаіць ён на перакрыжаванні дарог, злучаючых вялікія гарады, таму пабывала тут ледзь не ўся Еўропа. Перафразуючы вядомы вершаваны радок, усе мундзіры «в гости к нам». Апранутая ў салдацкія мундзіры, гэта самая Еўропа начавала ў лунінецкіх дамах, смяялася над нашымі звычаямі, гуляла па вуліцах горада, ахвотна ела нашых курэй і качак, свіней і кароў, наш хлеб з нашым маслам, садавіну і агародніну, абкладвала падаткамі насельніцтва. Каб там, у Еўропе, было добра жыць, страляла і рабавала людзей, крала нашы каштоўнасці, ламала агароджы, секла сады на дровы, паліла дамы з гаспадарамі ці без іх. Акрамя немцаў і аўстрыйцаў, мы ўжо бачылі славакаў і чэхаў, здраднікаў паліцаяў рускіх, украінцаў і беларусаў, нас вучылі «новаму парадку» паліцаі палякі і літоўцы. Былі і іншыя. Мы ўжо бачылі казакаў у нямецкай форме і рускую народную армію (РНА) таксама ў нямецкай форме.

І вось у горад наш прыбылі італьянцы, пасланцы дучэ Мусаліні. Восенню 1941 года яны ехалі праз Лунінец на фронт. Вестка пра тое, што на станцыі стаяць эшалоны з салдатамі ў іншай форме, разнеслася па горадзе. Усе хлопчыкі збегліся на чыгунку паглядзець на італьянцаў. Мундзіры былі амаль такога ж колеру, што і нямецкія. Адныя былі ў штанах навыпуск, другія ў чаравіках, абмотках і нейкіх укарочаных штанах-шара-

кай арміі, пасланцамі адмірала Хорці. Зноў чужыя салдаты, зноў зусім не зразумелая чужая мова, зноў «свае парадкі», канфлікты і праблемы. Венгерская форма была цёмна-гарчычнага колеру, воіны насілі нейкія чубатыя з вушамі пілоткі з вялікай какардай. Саюзнікі Гітлера былі бяднейшыя за армію нямецкага вермахта і па ўзбраенню, і па абмундзіраванню. Гэта назіралася нават па колькасці машын. У мадзьяр пераважала конная цяга. Але іх адносіны да жыхароў горада, акупіраванага імі Лунінца, не адрозніваліся ад нямецкіх. Мы не маглі ведаць, як немцы адносіліся да сваіх саюзнікаў, але на вайсковых могілках венграм быў выдзелены асобны ўчастак.

У суседнім з нашым доме пасяліўся малады афіцэр-мадзьяр па імені Франц, як потым высветлілася, – сын барона, буйнога землеўладальніка. Кожную раніцу яго дзяншчык Пожгай, сын батрака з маёнтка барона, гатаваў афіцэру цёплую ваду для ўмывання і галення, прыбіраў пасцель, трымаў ручнік, суправаджаў афіцэра ў туалет за хлявом (туалет быў тэрмінова перабудаваны, дарожка да яго пасыпана жоўтым пяском), чысціў мундзір з узнагародамі, у тым ліку і нямецкімі, боты. Пожгай выконваў мноства работ пры сваім гаспадары. Як здавалася нашай сям'і, штодня назіраўшай за жыццём

Яшчэ ў Лунінцы амаль увесь акупацыйны перыяд знаходзіліся казакі, якія ахоўвалі чыгунку, – некаторыя старонкі іх гісторыі паведамлю асобна.

Сярод нямногіх гарадскіх устаноў, працуючых у перыяд акупацыі для насельніцтва, была гарадская бальніца. Яна была размешчана на ўскрайку горада паміж Бахановам і Залессем. Ад чыгункі бальніцу аддзяляла даволі вялікая пясчаная дзюна, празваная ў народзе «Шпіталёвая горка». (Пасля вайны ў працэсе забудовы яна паступова знікла. А яшчэ ў даваенны час гэтую горку аблюбавала лунінецкая дзятва. Зімой пакатыя схілы дзюны пры шчодрым снезе ператвараліся ў месца масавага катання хлопчыкаў і дзяўчынак на санках і лыжах). На невялікім участку за гэтай горкай, які парос старымі соснамі, былі размешчаны некалькі вялікіх драўляных карпусоў. У адным з дамоў – прыёмны пакой, рэнтген, тэрапеўтычнае і дзіцячае аддзяленні. Хірургія займала асобны корпус на вуліцы Пушкінская. Кухня, склады, лядоўня, морг скучыліся за высокім шчыльным плотам.

Бальніца тут знаходзілася з пачатку XX стагоддзя. Пасля ўводу ў строй станцыі Лунінец Беларускай чыгункі ў сасновым лесе на пясчанай дзюне пабудавалі невялікі домік для амбулаторнага пункта.


KRANKENHAUS
in
Luninlec
den 5-VII 1944
Nr.

Удостоверение.

Настоящим удостоверяю, что К о л о с о в Леонид работ в здешней больнице от 2-3-41 г в качестве магазинера.

Работу бросил по поводу ликвидации больницы дн 5-7-44 г

Директор больницы

і ў пачатку акупацыі – доктар Ліхтэнштэйн, прыехаўшы з Варшавы (№99 «ЛН» ад 01.09.98).

Са жніўня 1941 года мой бацька працаваў тут кладаўшчыком і «работу бросил по поводу ликвидации больницы дня 5.7.44 г.», як сведчыць пра гэта даведка, падпісаная галоўным урачом **(на здымку)**. Пасля вызвалення ў некаторых карпусах бальніцы размяшчаўся ваенны шпіталь.

Шкада, што гісторыя адной са старэйшых устаноў Лунінца – гарадской бальніцы – яшчэ не напісана...

Восенню 1943 года ўсе ўладальнікі сабак у Лунінцы атрымалі строгае паведамленне гарадской управы прыбыць з «братамі меншымі» на рынак (стадыён) на вуліцы Легаўская (цяпер Чырвонаармейская). За ўхіленні ад загада прадпісвалася пакаранне. Пасля разгрому на Курскай дузе нямецкае камандаванне вырашыла расквітацца з савецкімі танкамі з дапамогай сабак. Было арганізавана масавае забіранне гэтых жывёлін ад насельніцтва. Працэдура вызначэння годнасці сабакі да «ваеннай службы» праходзіла такім чынам. Уладальнікі сабак павінны былі на кароткім павадку вадзіць сваіх пітомцаў па крузе, у цэнтры якога стаяў салдат і страляў у паветра. Па-за гэтым кругам знаходзіліся некалькі салдат-назіральнікаў. Калі пасля 2-3-х выст-

рытых школах з савецкай ідэалогіяй. Прызначылі яе, відавочна, таму, што яна мела нейкія адносіны да Лунінецкай рускай рэальнай гімназіі, была прыхільніцай усяго рускага (па тых часах, значыць – савецкага), мела на гэтай глебе невялікія канфлікты з польскай уладай, вельмі станоўча сустрэла Савецкую ўладу. Аднак вынікамі яе работы райкам партыі быў незадаволены. У пастанове аб рабоце курсаў адзначалася, што Тулейка не справілася з даручаным заданнем, што на занятках выказваюцца варожыя для Савецкай улады думкі, што навучанне вялося безыдэйна, не з класавых пазіцый. Рашэннем райкама партыі Тулейка была знята з работы без права працаваць педагогам, тым больш узначальваць навучальную ўстанову. Яна ўладкавалася правадніком на чыгунку. Адзін з двух дамоў, якімі валодала Тулейка (яны былі пакінуты ёй бацькамі ў спадчыну), у 1940 годзе канфіскавалі і перадалі ва ўласнасць гаркамгасу. У пачатку 1941 года была арыштавана органамі НКУС, праз 1,5-2 месяцы адпушчана на волю. Магчыма, гэтыя крыўды на Савецкую ўладу і тлумачаць паводзіны Тулейка ў гады акупацыі.

Хочацца прывесці таксама вытрымку з дырэктывы рэйхскамісара Украіны ад 12 студзеня 1942 года ўсім генерал- і гебітскамісарам аб умовах адкрыцця пачатковых школ:

*«...Колькасць настаўніцкіх сіл для правядзення скарочанага навучання трэба абмяжоўваць... Усе ўстаноўленыя бальшавікамі органы школьнага кантролю і настаўнікі старэйшых класаў звальняюцца... Настаўнікі, якія неяк супрацоўнічалі з КП, звальняюцца. Пенсіі не выплачваюцца.*

*Выкарыстоўваць існуючыя пры бальшавіцкім рэжыме навучальныя планы, падручнікі, вучнёўскія і выкладчыцкія бібліятэкі, а таксама палітычна тэндыцыёзныя вучэбныя дапаможнікі (фільмы, карты: карціны і г.д.) забаронена, прадметы гэтыя неабходна ўзяць пад ахову. Пакуль не падрыхтуюцца новыя навучальныя планы і падручнікі, уводзіцца свабоднае навучанне. Яно абмяжоўваецца чытаннем, пісьмом, лікам, фізкультурай, гульнямі, вытворчай і ручной працай. Мова навучання – украінская ці, адпа-*

ж колеру, што і німецкія. Адны былі ў штанах навыпуск, другія ў чаравіках, абмотках і нейкіх укарочаных штанах-шараварах з напускам. Вельмі здзівілі нас на іх форме эмблемы - серабрыстыя пяціканцовыя зорачкі на рукавах, пятліцах мундзіраў, пілотках. Гэта нават азадачыла: зорачкі – і супраць Чырвонай Арміі. Свет аказаўся не такім простым. Не ўсе сябры – з пяціканцовымі зоркамі, не ўсе сябры – прыйшоўшыя з Богам.

Салдаты і афіцэры Мусаліні запоўнілі перон, Прывакзальную плошчу, хадзілі па вуліцах, разглядваючы горад, азіраліся ўслед маладым жанчынам, цмокалі языкамі. Вясёлыя, маладыя, чарнявыя, смуглыя, падобныя на цыган, яны пілі віно з бутэлек, заядаючы сырам, курылі доўгія папіросы, тонкія карычневыя сігары, кідалі каляровыя, не падобныя на нямецкія, упакоўкі ад курыва на лунінецкую зямлю (мы іх тут жа падбіралі – на каробках былі намаляваны пальмы, рымская ваўчыца, старажытны Калізей). На станцыі тым хлопчыкам, якія асмеліліся падысці бліжэй да вагонаў, італьянцы давалі хлеб, сыр, папіросы, кавалкі каўбасы, нейкія кансервы. Спявалі вясёлыя песні і натоўпам хадзілі да кінутага савецкага падарванага танка, залазілі на яго, весела перагаворваліся на сваёй пявучай, не зразумелай нам мове. Рагаталі перад фотаапаратам, пазіруючы на «поверженном» танку.

Эшалоны ішлі некалькі дзён. І ўвесь гэты час мы, хлопчыкі ваенных гадоў, бегалі на чыгунку да пераезда, на станцыю глядзець на незвычайных салдат і, калі пашанцуе, атрымаць ад іх што-небудзь з ежы. Гэтыя людзі паводзілі сябе не як акупанты, не як немцы, – і ўсё ж гэта былі нашы ворагі.

Праз два гады італьянцы зноў паявіліся ў Лунінцы, але гэта ўжо была не вясёлая паездка – гэта былі эшалоны з палоннымі італьянцамі, гэта былі ворагі рэйха. Цяпер «веселые ребята» сядзелі за калючым дротам у адным лагеры з савецкімі ваеннапалоннымі. Цяпер мы падкормлівалі паўгалодных італьянцаў (№67 «ЛН» за 22.06.1996 г.).

Мадзьяры паявіліся ў Лунінцы ў 1942 годзе. Усе пустуючыя дамы ў горадзе і ўсе тыя, на якіх была намалявана вялікая літара «W» (для вермахта адбіраліся найбольш дыхтоўныя кватэры), былі занятыя салдатамі 3-яй мадзьярс-

пры сваім гаспадары. Як здавалася нашай сям'і, штодня назіраўшай за жыццём афіцэра-барона і яго дзеншчыка-працаўніка, рабіў гэта добрасумленна і хутка. Але не так думаў гаспадар. Вельмі часта мы бачылі, як Пожгая, які стаяў навыцяжку, афіцэр біў па твары рукой, зацягнутай у пальчатку, ці стэкам па спіне (у барона быў верхавы конь). Збіваючы дзеншчыка, афіцэр навакольных суседзяў не саромеўся – мы ж для яго былі ніжэйшай расай. Наогул ён ніколі нас не заўважаў... Іншы раз пасля такіх экзекуцый Пожгай на ломаной нямецкай мове скардзіўся маёй маці, што яго гаспадар злы і дрэнны, а ён ні ў чым не вінаваты.

У суседнім доме часта ўстрайваліся вечарынкі. Туды збіраліся мадзьяры-афіцэры з нейкімі жанчынамі, і кожнага з іх суправаджаў дзяншчык. Франц любіў народныя венгерскія мелодыі, таму часта з расчыненага акна даносіліся гукі радыёпрыёмніка, настроенага на хвалю Будапешта. А на падваконні стаялі ў рад невялікія гранаты – як велікодныя яйкі, расфарбаваныя ў розныя колеры: палова сіняя, палова чырвоная, з кропачкай-узрывальнікам і скуранай пяцелькай для падвескі.

Мадзьяры прабылі ў Лунінцы нядоўга, можа, з паўгода. Паехалі на фронт, дзе іх дастаткова пабілі. Ужо ў канцы 1943-пачатку 1944 года зноў паявіліся ў Лунінцы некалькі дзясяткаў венгерскіх вояк.

Закінуў ваенны лёс у наш горад і хлопцаў з далёкага Пірынейскага паўвострава. Некаторы час на лунінецкім аэрадроме ў «Люфтвафэ» гасцілі пралётам на фронт яшчэ адныя саюзнікі Германіі – іспанскія лётчыкі з «Блакітнай дывізіі» (паведамляў пра гэта ў №59 за 31.05 гг). Дадаць хацеў бы толькі пра палаш. Гэта халодная зброя накшталт шаблі – прамы клінок нямногім больш за 50 сантыметраў у даўжыню. Ён вісеў на баку ў чорных ножнах, і мы недаўмявалі: як з такім кінжалам лётчык улязае ў кабіну самалёта?!

лесе на пясчаным дзюне пабудавалі невялікі домік для амбулаторнага пункта. Затым чыгуначнікі пашырылі лячэбныя ўстановы да невялікай (калі гаварыць сучасным тэрмінам) паліклінікі. Да першай сусветнай вайны на ўчастку былі ўзведзены ўжо некалькі драўляных будынкаў, у якіх размясцілася лячэбніца (бальніца). Кіравала бальнічнай гаспадаркай жонка лунінецкага старшага кандуктара сястра міласэрнасці Фядора Валасевіч, ураджэнка сяла Вавулічы Гродзенскай губерні. У час усіх войнаў (першай сусветнай, грамадзянскай, польска-савецкай) тут размяшчаліся ваенна-палявыя лазарэты і шпіталі. Відавочна, таму і ваенныя могілкі былі размешчаны паблізу.

Яшчэ перад першай сусветнай вайной бальніца стала гарадской. Такой яна засталася і пры польскай уладзе (у пачатку 30-ых гадоў – 25 бальнічных ложкаў), і ў савецкі перыяд 1939-1941 гг.

У час акупацыі бальніца таксама працавала. На стацыянары лячыліся толькі грамадзянскія асобы мясцовага насельніцтва. За лячэнне, лекі трэба было плаціць і абавязкова – здаваць прадукты ў бальнічную кладоўку. Абмежаванняў не было – усё ішло ў агульны кацёл для харчавання хворых. Узначальваў бальніцу лунінчанін доктар Панін. Працавала таксама некалькі вядомых лунінецкіх урачоў

знаходзіліся некалькі салдат-назіральнікаў. Калі пасля 2-3-х выстралаў сабака ад страху прысядаў на заднія лапы, ён лічыўся нягодным. Калі сабака не баяўся выстралаў, яго тут жа забіралі ў гаспадара і сажалі ў клетку ў кузаве аўтамашыны. Звычайна сабак прыводзілі хлопчыкі, якія не хацелі добраахвотна развітвацца з чацвяраногім сябрам, і адбіранне суправаджалася крыкам, віскам, плачам – тады салдаты прымянялі прыклады, штурхалі нагамі. Немцаў не цікавіла парода сабакі ці яго рост. Таму ў клеткі траплялі і маленькія, і вялікія бясстрашныя дварнягі. Усе яны былі адвезены ў спецыяльную сабачую школу, дзе іх навучалі падпаўзаць да танкаў і аўтамашын і кідацца пад гусеніцы ці пад колы. На спіне ў сабак немцы замацоўвалі міны. Такая акцыя па адбору сабак для вайны праводзілася ў Лунінцы і вясной 1944 года.

Мой сабака Найда не прайшоў «прызыўную камісію». Але ён таксама стаў ахвярай вайны. Яго застрэлілі адступаючыя нямецкія салдаты. Засталіся 4 шчанюкі, якія таксама не выжылі ў той суровы час.

**Л. КОЛАСАЎ.**

**Працяг будзе.**

Калектыў філіяла «Харчтавары» райспажыўтаварыства глыбока смуткуе з прычыны смерці былога прадаўца
**Надзеі Назараўны БУТ-ГУСАІМ**
і выказвае спачуванне **Людміле Якаўлеўне БУТ-ГУСАІМ** і яе сям'і з прычыны смерці **свекрыві**.

---

Адміністрацыя і прафкам філіяла «Грамадскае харчаванне» райспажыўтаварыства выказваюць глыбокае спачуванне **Алене Міхайлаўне БРЭЗІНАЙ** у сувязі са смерцю **брата**. Глыбока смуткуем разам з Вамі, падзяляючы вялікае гора. Няхай наша душэўная спагада будзе для Вас падтрымкай у гэту цяжкую хвіліну.

---

Выказваем глыбокае спачуванне **Мікалаю Ціханавічу НІЖЭЛЬСКАМУ** ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам – заўчаснай смерцю **сына СЯРГЕЯ.**

Жыхары дома № 10 па вул. Меліярацыйнай.

---

Выказваем глыбокае спачуванне **Віктару Іванавічу СТАРАВОЙТАВУ** ў сувязі з трагічнай смерцю **маці**.

Суседзі.

---

Вучнёўскі прафкам ПТВ-160, навучэнцы групы № 22, класны кіраўнік і майстры групы выказваюць глыбокае спачуванне навучэнцу **Сяргею СТАРАВОЙТАВУ** ў сувязі з напаткаўшым яго горам – смерцю **бабулі Ганны Раманаўны СТАРАВОЙТАВАЙ.**

---

Калектыў РУВП «Лунінецкі РМЗ» выказвае глыбокае спачуванне токару эксперыментальнага ўчастка **Аляксею Іванавічу СТАРАВОЙТАВУ** ў сувязі з напаткаўшым яго горам – смерцю **маці**.

---

Калектыў ПМК-7 выказвае глыбокае спачуванне сталяру **Віктару Іванавічу СТАРАВОЙТАВУ** ў сувязі з напаткаўшым яго горам - смерцю **маці**.

---

Калектыў філіяла «Харчтавары» райспажыўтаварыства выказвае глыбокае спачуванне **Таццяне Іванаўне ПАШКЕВІЧ** з прычыны трагічнай смерці **маці**.

---

Калектыў ясляў-сада № 11 «Светлячок» выказвае глыбокае спачуванне **Вользе Мікалаеўне ДАШКЕВІЧ** у сувязі з напаткаўшым яе горам - смерцю **маці**.

---

**Паважаная Святлана Вячаславаўна!** Прыміце нашы шчырыя спачуванні ў сувязі з напаткаўшым Вас горам - смерцю **брата**.

Калектыў ясляў-сада № 11 «Светлячок».